# БЕЛАРУСКАЕ ПЫТАННЕ Ў СЯРЭДНЯЙ ЛІТВЕ

С.В. Багалейша (Мінск)

Польшча і Літва, якія ў 1918 г. адрадзілі сваю дзяржаўную незалежнасць, вялі вострыя спрэчкі за землі Віленшчыны і Гродзеншчыны. Кульмінацыя іх дасягнула ў кастрычніку 1920 г., калі польскія войскі пад камандаваннем генерала Люцыяна Жалігоўскага занялі Вільню і суседнія тэрыторыі і стварылі на тых землях марыянетачную дзяржаву – Сярэдняя Літва (Litwa Srodkowa) са сталіцай у Вільні, якая існавала ў 1920 – 1922 гг. “Сярэдняя Літва” пакінула балючы след у нацыянальнай гісторыі польскага і літоўскага народаў. У яе гісторыі значную ролю адыгралі і беларусы.

Кіруючыя колы Польшчы і асабліва Ю. Пілсудскі былі незадаволены Сувалкаўскім пагадненнем, заключаным 7 кастрычніка 1920 г. па якому Вільня і Віленскі край заставаліся за Літвой. Палякі былі апантаны ідэямі адраджэння Польшчы ў межах 1772 г. Каб вярнуць пад свой кантроль Віленшчыну, яны пачалі падрыхтоўку “да бунту” дывізіі Л. Жалігоўскага, якая была спецыяльна сфарміравана ў асноўным з салдат і афіцэраў, што нарадзіліся ў Віленскім краі. Ёй даручалася заняць тыя землі. Захоп павінен быў фармальна нагадваць “бунт” літоўска-беларускай дывізіі, якая “вырашыла” вызваліць Віленшчыну ад літоўскай акупацыі. Яшчэ 29 верасня 1920 г. Ю. Пілсудскі паклікаў да сябе ў штаб-кватэру генерала Л. Жалігоўскага. Падчас размовы ён сказаў: “Калі цяпер мы не здабудзем Вільні, гісторыя нам не даруе… Зрабіць гэта можа толькі само насельніцтва – яе сыны з Літоўска-беларускай дывізіі. Трэба, каб хтосьці ўзяў на сябе гэтую справу”. Такім чынам, Ю. Пілсудскі прапанаваў генералу ўзначаліць войскі, якія ўступяць у Вільню. Жалігоўскі пагадзіўся з прапановай і пачаў падрыхтоўку да “бунту” [14, с. 39].

8 кастрычніка вайсковая група “Беняконі” на чале з Л. Жалігоўскім выйшла з-пад парадкавання польскаму вярхоўнаму камандаванню і пачала рухацца на Вільню “выручать Виленщину из-под господства Ковенского Литовского Правительства, которым сдан этот край большевиками против воли населения Виленщины и Гродненщины”. 9 кастрычніка Вильня была захоплена [1, с. 910]. Літоўцы палічылі за лепшае не бараніць горад і адвялі свае войскі ў бок Коўна. На занятай тэрыторыі ўтваралася фармальна незалежная ад Польшчы так званая Сярэдняя Літва (Litwa Srodkowa) са сталіцай у Вільні.

Узброены захоп Вільні польскім войскам не быў ніякім “бунтам Жалігоўскага”. Гэта была добра спланаваная ў польскіх вярхах акцыя. Урад Польшчы, каб зняць з сябе адказнасць, заявіў, што Л. Жалігоўскі дзейнічаў “самачынна”, хаця 24 жніўня 1923 г. Ю. Пілсудскі, выступаючы ў Вільні, сказаў, што “прыйшла чарга генерала Л. Жалігоўскага, які дзейнічаў пад маім непасрэдным кіраўніцтвам і выконваў мае даручэнні... [4, с. 468].

Заняцце Жалігоўскім Вільні мела значны міжнародны рэзананс. Першапачаткова краіны Антанты разглядалі “мяцеж” як польскую акцыю. Ужо 12 кастрычніка 1920 г. Англія і Францыя звярнуліся да Польшчы з

Репозиторий ВГУ

нотай, у якой падкрэслілі, што акупацыя Вільні не суадносіцца з асноўнымі прынцыпамі Лігі Нацый. Аднак гэтае сумеснае выступленне абедзвюх дзяржаў не сведчыла аб адзінстве поглядаў на Віленскае пытанне. У сваю чаргу, польскі ўрад падкрэсліваў, што ён не мае дачынення да дзеянняў Л. Жалігоўскага. "Генерал Л. Жалігоўскі дзейнічаў насуперак нашым загадам, ён выйшаў з падпарадкавання і з'яўляецца мяцежнікам", – сцвярджаў польскі ўрад [6, с. 116]. У рэшце рэшт, ён здолеў пераканаць у гэтым дзеячаў Антанты. Літоўскі ўрад не мог змірыцца са стратай Вільні, таму літоўскае войска некалькі разоў спрабавала пачаць наступленне. Але ваенна-кантрольная камісія Лігі Нацый пад кіраўніцтвам французскага палкоўніка Шардзін'і патрабавала спыніць ваенныя дзеянні [12, с. 83]. У выніку ўмяшання Кантрольнай камісіі Лігі Нацый 29 лістапада паміж прадстаўнікамі польскага і літоўскага ўрадаў было заключана перамір'е і ўстанаўлівалася дэмаркацыйная лінія.

12 кастрычніка Л. Жалігоўскі выдаў шэраг дэкрэтаў, якія рэгулявалі жыццё на захопленых яго войскамі тэрыторыях. Згодна з першым дэкрэтам галоўнакамандуючага войскамі Сярэдняй Літвы, абвяшчалася стварэнне незалежнай і нібыта суверэннай дзяржавы Сярэдняя Літва. За мяжу новай дзяржавы прымалася лінія, вызначаная савецка-літоўскім дагаворам ад 12 ліпеня 1920 г. і літоўска-польскай дэмаркацыйнай лініяй ад 1 чэрвеня 1920 г. Тэрыторыя Сярэдняй Літвы ахоплівала каля 10 тыс. кв. км і налічвала 530 тыс. жыхароў, 40% з якіх складалі беларусы [5, с. 484].

Пасля стварэння Сярэдняй Літвы Жалігоўскі звярнуўся да польскага кіраўніцтва з просьбай прызнаць яе незалежнасць. Таксама ён прапанаваў ураду Літвы ў Коўна і прадстаўнікам беларускіх арганізацый накіраваць сваіх людзей у Вільню для ўдзелу ў Часовай камісіі, якая выконвала функцыі ўрада. У першы перыяд існавання Сярэдняй Літвы ў сувязі з маючым адбыцца плебісцытам Часовая камісія праводзіла ў адносінах да беларусаў ліберальную палітыку. Першапачаткова беларускія прадстаўнікі, у адрозненне ад літоўцаў, лічылі неабходным прыняць удзел ва ўрадзе Сярэдняй Літвы. [10, л. 10]. В. Іваноўскі заняў у Часовай камісіі пасаду кіраўніка дэпартамента грамадскага забеспячэння, Ю. Іваноўскі стаў дырэктарам дэпартамента замежных спраў, а Б. Тарашкевіч – кіраўніком аддзела беларускага школьніцтва ў дэпартаменце асветы [13, с. 239]. Дзеянні гэтых беларускіх дзеячаў не падтрымаў Віленскі БНК. Падчас размовы яго прадстаўнікоў з прадстаўнікамі Антанты было падкрэслена, што адзіным правамоцным прадстаўніком беларускага народа з'яўляецца ўрад В. Ластоўскага, які падчас канфлікту займаў зусім іншую пазіцыю [11, л. 312].

Кіруючыя колы Літвы, зразумела, не маглі змірыцца з тэрытарыяльнымі стратамі, у першую чаргу, са стратай Вільні. Яны разглядалі гэта як рэальную пагрозу для сваёй дзяржаўнасці. Усё гэта стала новым стымулам для супрацоўніцтва літоўскага ўрада з беларускімі дзеячамі, згуртаванымі вакол В. Ластоўскага. 11 лістапада 1920 г. паміж Літвой і ўрадам БНР пад кіраўніцтвам Ластоўскага было заключана сакрэтнае пагадненне аб палітычным супрацоўніцтве. Згодна з ім урад В. Ластоўскага

Рэпазіторый ВДУ

гарантаваў Літве падтрымку беларускага насельніцтва падчас плебісцыту. Літоўскі ўрад паабяцаў, што тэрыторыі, дзе беларускае насельніцтва складала большасць, будуць кіравацца на аснове нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі. Беларусы, у сваю чаргу, разгарнулі агітацыю на карысць Літвы. Актыўна ў гэтым напрамку дзейнічаў беларускі перыядычны друк. Віленскія беларускія газеты "Наша думка" і "Крыніца" заклікалі беларускае грамадства аб'яднаць свае сілы разам з літоўцамі. Газета "Беларускі Звон" 22 сакавіка 1921 г. пісала, што няма ніводнага беларускага палітыка, які не сімпатызаваў бы літоўцам [3, с . 335].

Ідучы насустрач апеляцыям Літвы, Ліга Нацый 28 кастрычніка 1920 г. вырашыла правесці на тэрыторыі Сярэдняй Літвы плебісцыт. Спачатку польскі ўрад на гэта не згаджаўся, але 7 студзеня 1921 г. даў згоду на яго правядзенне. На старонках газеты "Беларускае слова" быў надрукаваны вялікі артыкул "Ліга Нацый аб плебісцыце на Цэнтральнай Літве", у якім былі змешчаны падрабязныя пастановы Лігі Нацый па гэтым пытанні, а таксама паказаны адносіны да яго польскага ўрада і генерала Жалігоўскага [2].

На спрэчных тэрыторыях пражывала 40% беларускага насельніцтва [15, с. 362]. Таму за развіццём узнікшага канфлікту пільна сачылі кіраўнікі БНР і беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі. Абодва бакі – і польскі, і літоўскі – імкнуліся заручыцца іх падтрымкай. Літоўцы зрабілі ўсё магчымае, каб прыцягнуць на свой бок сімпатыю і падтрымку падчас плебісцыту беларускіх палітычных лідараў і беларускага насельніцтва краю. Выконваючы ўмовы дагавора, урад БНР разгарнуў актыўную дзейнасць. 16 лістапада 1920 г. Віленскі БНК выступіў супраць мабілізацыі, абвешчанай Л. Жалігоўскім. "Нельга прымушаць наш народ, каб ён сваёй крывёй купляў тое, аб чым яшчэ не высказаў сваёй волі, тым больш, што народ беларускі – такі ж самы прэтэндэнт на спорныя землі, як польскі і літоўскі. Мы просім адкласці тэрмін абвешчанай мабілізацыі да таго моманту, пакуль воля насельніцтва нашага краю не будзе выяўлена…", – гаварылася ў звароце да генерала [8, л. 280].

Даволі настойліва беларусы спрабавалі наладзіць супрацоўніцтва з Лігай Нацый і звярнуць увагу на беларускае пытанне ў Сярэдняй Літве. Дэлегацыя БНР у складзе В. Ластоўскага, А. Цвікевіча, Л. Баркова, Д. Анэкштэйна і Я. Ладнова з 10 па 16 снежня наведала Жэневу. У выніку ўрад БНР у двух мемарандумах за 16 і 18 снежня 1920 г. звярнуўся да Лігі Нацый у сувязі з фактам захопу Польшчай беларускіх зямель (Віленшчыны і Гродзеншчыны) і прыцясненнямі беларусаў на гэтай тэрыторыі. У першым дакуменце кіраўнікі БНР імкнуліся абгрунтаваць гістарычнае права беларусаў і літоўцаў на валоданне Вільняй. У звароце гаварылася: "Вільня ніколі не была польскім месцам. Гэта старажытная сталіца Літвы і Беларусі, палітычны, культурна-асветніцкі і духоўна-рэлігійны цэнтар літоўцаў-католікаў і праваслаўных беларусаў. Насельніцтва Віленшчыны толькі літоўска-беларускае. Прэтэнзіі Польшчы на Вільню груба пярэчаць довадам гісторыі і этнаграфіі і топчуць

Рэпазіторый ВДУ

нацыянальна-дзяржаўныя правы Літвы і Беларусі. Вільня не можа адысці да палякаў, гэта месца беларусаў і літоўцаў, гэта іх спадчына, іх святыня" [9, л. 12–13]. "Факт правядзення Лігай Нацый плебісцыту для вызначэння дзяржаўнай прыналежнасці Віленшчыны з'яўляецца заахвочваннем экспансіі Польшчы. Беларускі ўрад разглядае пытанне аб плебісцыце як далучэнне беларускіх зямель да Польшчы і недапусцімы ў інтарэсах беларускага народу акт. Простая справядлівасць патрабуе, каб плебісцытная формула была пераменена і пабудавана згодна дадзенымі гісторыіі і этнаграфіі" – сцвярджалася ў першым мемарандуме [7, с. 231]. У другім мемарандуме, прысвечаным становішчу Беларусі, урад БНР патрабаваў часова перадаць пад кіраўніцтва Літвы тэрыторыю ад лініі Керзана да савецка-літоўскай мяжы па дагаворы ад 12 ліпеня 1920 г. У гэтым дакуменце таксама атрымалі канкрэтызацыю беларускія прапановы адносна правядзення на Віленшчыне плебісцыту. У прыватнасці, дзеячы БНР настойвалі, каб плебісцыт праводзіўся толькі на тэрыторыі паміж "лініяй Керзана" і рэкамі Заходні Буг і Нараў як на спрэчнай тэрыторыі. У склаўшыхся ўмовах урад БНР пагадзіўся на часовую перадачу гэтых тэрыторый пад упраўленне літоўскай дзяржавы для забеспячэння правоў жыхароў беларускай нацыянальнасці [1, с. 991].

18 лютага 1921 г. віленская беларуская газета "Наша думка" выставіла патрабаванні правядзення плебісцыту на ўсёй тэрыторыі, далучанай да Польшчы па Рыжскаму пераміра'і. "Наша гора ў тым, – пісала газета, – што мы не маем ні пядзі ўласнай тэрыторыі, на якой бы была беларуская ўлада. Па гэтай прычыне мы павінны згадзіцца на плебісцыт на тых тэрыторыях, дзе наша насельніцтва складае звыш 80%. Плебісцыт – гэта ўсё ж такі лепей, чым прамое далучэнне да чужой краіны ці падзел паміж суседзямі" [11, л. 237].

Канчаткова пытанне аб палітычнай прыналежнасці Сярэдняй літвы павінен быў вырашыць сейм Сярэдняй літвы і плануемы ў рамках выбараў плебісцыт. Першапачаткова выбары ў сейм былі прызначаны на 9 студзеня 1921 г. Аднак Ліга Нацый выступіла супраць выбараў. Слова "плебісцыт" было амаль самым папулярным у Вільні ў 1921 г. Усе ведалі аб тым, што насельніцтва Віленшчыны павінна выказацца адносна сваёй магчымай дзяржаўнай прыналежнасці. Але плебісцыт так і не адбыўся. Адразу ж узнікае пытанне "Чаму?". Таму што абедзве дэлегацыі не змаглі дамовіцца аб тэрыторыі, на якой павінна было праходзіць галасаванне. 2 сакавіка Савет Лігі Нацый, які бачыў бясплённасць сваіх далейшых намаганняў, прыняў пастанову аб перадачы вырашэння польска-літоўскага канфлікту на разгляд урадавых дэлегацый пад старшынствам прадстаўніка Бельгіі ў Лізе Нацый міністра замежных спраў Бельгіі Поля Гіманса [11, л. 223].

Такім чынам, пасля стварэння Сярэдняй Літвы ўрады Польшчы і Літвы імкнуліся прыцягнуць беларускіх нацыянальных дзеячаў і ўсіх беларусаў на свой бок, выкарыстоўваючы для гэтага розныя сродкі. У сваю чаргу дзеячы БНР разгарнулі актыўную палітычную дзейнасць і настойліва дамагаліся, каб свет даведаўся аб тым, што ў польска-літоўскім канфлікце ёсць яшчэ адзін бок – беларускі, што зацятая спрэчка паміж дзвюма дзяржавамі – Польшчай і Літвой – адбываецца за тэрыторыі, на якой беларусы складаюць большасць

Рэпазіторый ВДУ

насельніцтва. Беларускія дзеячы лічылі правядзенне плебісцыту на спрэчных тэрыторыях адзіным правільным варыянтам вырашэння канфлікту, абяцаўшы літоўцам падтрымку беларускага насельніцтва краю.


1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: у 2 кн. / уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт, камент, пер., паказ. С. Шупы. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага: Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва: Т-ва бел. Пісьменства “Наша ніва”, 1998. – Т. 1. – Кн. 2. – 1721 с.
2. Беларускае слова. – 1920. – 10 снежня.
3. Весялкоўскі, Ю. Беларусь у Першай сусветнай вайне (Гістарычны нарыс) / Ю. Весялоўскі; рэд. А. Мірановіч. – Беласток – Лёндан, 1996. – 361 с.
4. Документы и материалы по истории советско-польских отношений / [Акад. Наук СССР. Ин-т славяноведения]; Ред. коллегия: советская часть: И.А. Хренов (отв. ред.) [и др.]; польская часть: Н. Гонсеровская-Грабовская (отв. ред.) [и др.]. – М.: Изд-во Акад. Наук СССР, 1965. – Т. 3. (апрель 1920 г. – март 1921 г.) – 607 с.
5. Дубік, С. (Багалейша С.) Сярэдняя Літва / С. Дубік, А. Чарнякевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 6. – Ч. 1. – С. 483 – 485.
6. Zeligowski, L. Wojna w roku 1920: Wspomnienia i rozwazania / L. Zeligowski. Wyd. 2. – Warszawa: Wyd-wo Min Obrony Nar, 1990. – 157 s.
7. Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]; склад.: У.М. Міхнюк, рэдкал.: І.І. Антановіч (старшыня) і інш. – Мн.: БелНДІДАС: Выдавецкі цэнтр БДУ, 1997. – Т. 1. (1917 – 1922 гг.). – 395 с.
8. НАРБ. – Ф. 325. – Воп. 1. – Спр. 59. – Л. 280.
9. НАРБ. – Ф. 325. – Воп. 1. – Спр. 104. – Л. 12 – 13.
10. НАРБ. – Ф. 325. – Воп. 1. – Спр. 110. – Л. 10.
11. НАРБ. – Ф. 325. – Воп. 1. – Спр. 112. – Л. 223, 237, 312.
12. Рубцов, А.Ф. Литва в политике французского империализма (1918 – 1924 гг.) / А.Ф. Рубцов. – Томск: Изд-во Том. ун-та, 1988. – 230 с.
13. Туронак, Ю. В. Іваноўскі і адраджэнне Беларусі / Ю.В. Туронак // Маладосць. – 1994. – № 8. – С. 197 – 250.
14. Ціхаміраў, А. “Віленскае пытанне” ў міжнародных адносінах 1918 – 1920 гг. / А. Ціхаміраў // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2002. – № 3. – С. 37 – 45.
15. Чарнякевіч, А. Сярэдняя Літва / А. Чарнякевіч // Беларуская энцыклапедыя. – Мн, 2002. – Т. 15. – С. 362 – 363.


Репозиторий ВГУ